Источник: **«Звязда» - 2012-08-25**

## Феномен Уладзіміра Гніламёдава

Падчас працы ў Інстытуце літаратуры НАН Беларусі Віктар Антонавіч Каваленка прапанаваў мне напісаць для «Гісторыі беларускай літаратуры XX стагоддзя» раздзел пра творчасць В. Коўтун. Пачаўся звычайны працэс: перачытванне паэтычных кніжак аўтара, знаёмства з крытычнай літаратурай. І мне патрапіла ў рукі кніга У. Гніламёдава “Сучасная беларуская паэзія. Творчая індывідуальнасць і літаратурны працэс” (1983). Кніга мяне ўразіла. Наколькі тонка і пранікнёна бачыў даследчык мастацкі свет паэтаў. Глыбока разумеў філасофію твораў, заўважаў дэталі, найтонкія адценні, фарбы. Слова яго было лёгкім і зразумелым і, разам з тым, навукова адказным, аргументаваным.

Цяпер я ведаю, што гэтай манаграфіі папярэднічаў шэраг іншых грунтоўных манаграфічных прац ("Лірычны летапіс часу", "Сучасная беларуская паэзія", "Традыцыі і наватарства", зборнікі літаратурна-крытычных артыкулаў. Пасля былі іншыя сур'ёзныя працы: "Ля аднаго вогнішча", "Класікі і сучаснасць", "Праўда зерня: творчы партрэт Васіля Зуёнка", "Янка Купала: новы погляд", і г.д. Можна сказаць, акадэмік У.Гніламёдаў напісаў сваю адметную гісторыю беларускай паэзіі XX стагоддзя. Ён стаў сапраўдным аўтарытэтам для многіх навукоўцаў і шматлікай арміі студэнтаў-філолагаў. Толькі, нягледзячы на ўсё гэта, яму ўвесь час карцела выйсці за межы "чыстай" навукі, заняцца пісьменніцкай працай, карцела звярнуцца да сваіх каранёў, да сакральнага — гісторыі свайго рода, сваёй малой радзімы.

У. Гніламёдаў распачаў маштабную працу, фармальна абазначыўшы яе як "Сямейная хроніка ў духу барока".



Першы раман "Уліс з Прускі" з'явіўся ў 2000 годзе. Ён прысвечаны амерыканскай адысеі галоўнага героя "Хронікі" Лявона Кужаля і закранае канец XIX—пачатак XX стагоддзя. (Асобным выданнем твор выйшаў у 2006 годзе ў выдавецтве "Мастацкая літаратура", а ў 2007 годзе быў адзначаны прэміяй "Залаты Купідон".) Другі раман "Усход" храналагічна звязаны з падзеямі Першай сусветнай вайны, бежанствам, рэвалюцыяй, грамадзянскай вайной. Ён друкаваўся на працягу 2003—2005 гадоў у часопісе "Полымя". Асобнай кніжкай, але ўжо пад назвай "Расія", ён выйшаў у 2007 годзе. У тым жа "Полымі" на працягу 2006—2008 гадоў друкаваўся і трэці раман цыкла — "Вяртанне" (асобна выйшаў у 2008 годзе). Тут аўтар адлюстроўвае няпростую сітуацыю 1920-х гадоў у Заходняй Беларусі. У чацвёртым рамане "Валошкі на мяжы" (Полымя, 2009 — 2011 гг.) паказана далейшае развіццё падзей на Берасцейшчыне: 1930-я і пачатак 1940-х гадоў, калі на змену ўлады палякаў прыйшла савецкая ўлада. Польская каланіяльная сістэма саступіла месца бальшавіцкаму дыктату. У чэрвеньскім нумары часопіса "Полымя" сёлета распачата публікацыя чарговага рамана "Ліхалецце", дзе закранаюцца ўжо падзеі Айчыннай вайны 1941—1945 гг.

У. Гніламёдаву, як і Марселю Прусту ў яго геніяльнай працы "У пошуках страчанага часу", было вельмі важна перадаць сваё адчуванне радзімы, сваё адчуванне часу, гісторыі праз сукупнасць адчуванняў сваіх продкаў, землякоў, праз сукупнасць фактаў чалавечага перажывання ўвогуле. Як і Прусту, У. Гніламёдаву было невыносна цяжка,

што свет, які ён адчувае, носіць у сабе, знікне, сыдзе ў нябыт разам з ім. Знікне яго Пруска, яго эпоха, яго гісторыя, а разам з імі — і тыя глыбінныя духоўныя каштоўнасці, носьбітамі якіх яны з'яўляюцца. Адсюль і адна з галоўных задач пісьменніка — адлюстраваць жыццё роднай вёскі Прускі, у якой нараджаліся і жылі яго продкі, адкуль пайшоў ён сам.

Сувязь з эпічнымі традыцыямі К. Чорнага, І. Мележа, І. Чыгрынава (да гэтых творцаў-эпікаў можна далучыць і рускага пісьменніка М. Шолахава, аўтара "Ціхага Дона") відавочная. Яна — у глыбіні быційнага адлюстравання, у канцэптуальным вырашэнні чалавека наогул і чалавека гэтага, у непарыўнай повязі лакальнага, індывідуальна-непаўторнага свайго "дома", з "домам" нацыянальным, а праз яго — з агульначалавечым прыродным "домам".

У "Хроніцы" дамінуе калектыўнае "мы" вяскоўцаў. І не толькі прускаўцаў. У рамане "Расія" да іх далучаюцца і галасы запалонцаў — галасы рускага народа. Гэтае "ўзбуйненае" калектыўнае "мы" сінтэзуе "хоры" двух славянскіх народаў.

Гніламёдаву-раманісту XXI стагоддзя ўдалося найбольш глыбока спасцігнуць драматычную сутнасць сацыяльных, духоўных перамен першых дзесяцігоддзяў XX стагоддзя, маштабна адлюстраваць унутраную драму беларускага народа.

Галоўны герой "Хронікі" Лявон Кужаль — вобраз-тып, які па сваёй анталагічнай сутнасці стаіць упоравень з коласаўскім Міхалам і мележаўскім Васілём Дзятлікам. Менавіта стаўленне да зямлі вызначае характар і сацыяльную пазіцыю гэтых герояў. Лявон сваё жыццё і сваю будучыню таксама звязвае з працай на зямлі. І менавіта на зямлі сваіх продкаў. Ён душою адчувае <I>"прыемнае цяпло зямлі" , яе жыццядайную сілу, а між тым лёс штурхаў яго па іншых жыццёвых сцяжынах. Герой хацеў проста жыць. Як жыў яго дзед Кірыла, як жылі прускаўцы, увесь беларускі народ. Жыць на сваёй зямлі і ў сваім доме — канкрэтным бацькоўскім доме. Вобразы зямлі і бацькоўскага дома ў прозе У. Гніламёдава насычаюцца глыбокім філасофскім зместам і набываюць статус архетыпаў нацыянальнага дома. Яны трансфармуюцца ў абагульнены вобраз радзімы.

Лявон Кужаль хацеў жыць сваім, "зямельным" інтарэсам, сваім домам, сваёй сям'ёй. *"Толькі зямля дазваляе жыць сумленна. Калі яе даглядаць. Калі думаць пра яе".*

З паняцця зямлі "вырастае" паняцце радзімы. Радзіма — гэта не толькі дом, сям'я, вёска, блізкія людзі. Радзіма для героя У. Гніламёдава — гэта яшчэ і зямля яго продкаў, і яго зямля, — расквечаная фарбамі і гукамі. А яшчэ — гэта пах чабору. Гніламёдаўскі вобраз чабору нібыта перагукаецца з багдановічаўскім вобразам валошкі.

Трагічны матыў вобраза Лявона, заяўлены ў першых дзвюх кнігах "Хронікі", у рамане "Вяртанне" прасвятляецца верай у чалавека, яго жыццядайную сілу. Лінія развіцця вобраза Лявона Кужаля падкрэслівае настойлівую неабходнасць самабытнага ўдзелу чалавека ў стваральным жыцці. У гэтым пісьменніку бачыцца яго, чалавека, выратаванне і яго свабода. Усё, аб чым раней марыў герой у сваіх "блуканнях па пакутах", здаецца, збылося. Ён збудаваў сабе дом, займеў добрую гаспадарку, нават малатарню прыдбаў, а галоўнае, купіў зямлі ў Пацаў, стаў заможным гаспадаром. *"Жыццё ішло сваім ходам".*

Вобраз Лявона 1920-х—1930-х гадоў — гэта сцвярджэнне ідэі захавання ўнутранага "я" беларуса, яго нацыянальнага "дома", захавання пераемнасці духоўнага ладу жыцця.

Але вось надышло лета 1939 года. У Пруску прыйшла Чырвоная Армія, а ўвосень Народны сход у Беластоку абвясціў Савецкую ўладу на ўсёй тэрыторыі Заходняй Беларусі. Вясной 1940 года ў маёнтку пана Падгурскага пачалася арганізацыя камуны. ***"Свет страціў ранейшы свой парадак...".***

Лявон 1940-х гадоў — гэта ўжо матыў страчанасці спрадвечных духоўных сувязяў паміх людзьмі, паміж чалавекам і "домам". Трагедыя Лявона яшчэ і ў тым, што ён стаў апошнім з магікан сялянскага роду Кужаляў. Яго вялікая радасць у жыцці — Васятка, які нарадзіўся не яго сынам, але стаў яму родным, падаўся ў горад, здрадзіў не толькі вёсцы, але і яму, Кужалю, — бо адмовіўся ад яго прозвішча, вярнуў сабе расейскае, па бацьку — Платонаў.

Сялянскі род Кужаляў перарываецца...

У раскрыцці духу народа В.Бялінскі бачыў прыкметы эпапеі. У цэнтр свайго адлюстравання
У. Гніламёдаў "паставіў" дух *"стомленага народа",* якому *"надакучыла думаць пра будучыню, ён даўно ўжо адвык ад гэтага занятку. Проста — жыў, па інерцыі".*

У мастацкай канцэпцыі У. Гніламёдава вобразы герояў у мініяцюры мадэлююць працэсы інтэграцыі і дыферэнцыяцыі ў народным асяроддзі складаных сацыяльных працэсаў канца XIX і першай паловы XX стагоддзя. Разам з тым, пісьменнік у сваіх тэкстах індывідуальна-непаўторнае імкнецца дапоўніць, заглыбіць да больш агульнага. Акрэсліваюцца характэрныя сацыяльныя тыпы сялян — ад зусім бедных да заможных, — якія сфарміраваліся ва ўмовах вясковай рэчаіснасці, з улікам спецыфічнага нацыянальнага каларыту. Праз нацыянальнае пісьменнік звязвае сваіх герояў не толькі з пэўнай геаграфічнай прасторай, але і з духоўнай гісторыяй, духам продкаў. Такі Лявон Кужаль, дзед Кірыла, Марыля, Гамон, Пракоп, Масей Галёнка, Захар Відэрка, Пятро Ламака, Васіль Каленік, мясцовы блукальнік па зямлі Кузёмка...

Гніламёдаў-празаік ужо на пачатку трэцяга тысячагоддзя імкнецца зразумець нацыянальны склад быцця беларусаў. Хто такія беларусы пад сонцам адзіным для ўсяго свету, беларускі дух — ціхмяны і нязломны адначасова? Беларускі шлях — загадкавы і непарушны? У гэтым плане яго тэксты працягваюць традыцыі мастацкіх дыскурсаў К. Чорнага, І. Мележа, І. Пташнікава, В. Быкава, І. Чыгрынава, У. Караткевіча...

"Хроніка" У. Гніламёдава — гэта твор, які з вялікай сілай выражае ўнутранае памкненне нацыянальнай літаратуры да эпасу, памкненне ўвасобіць свет-універсум у адзінстве яго прыродных і гістарычных сувязяў. У адзінстве Чалавека і свету.

***

Шматграннасць таленту Уладзіміра Гніламёдава праяўляецца ў яго памкненні да мастацкага эксперыменту. Элементамі навізны пазначана яго "Хроніка", дзе сублімуюцца і канвергуюцца розныя стылявыя пласты, апавядальныя жанры, фальклорныя матывы, дакументальнае пісьмо. Не менш цікавым вопытам мастацкай дакументалістыкі з'яўляецца яго раман-дзённік "Сем гадоў у ЦК" (надрукаваны ў "Полымі" ў 2011 г.). З 1969 па 1976 год пісьменнік працаваў у апараце ЦК КПБ. Але і там ён імкнуўся, як і заўсёды, *"заставацца сабой".*

Раман-дзённік — гэта не толькі храналогія асабістага жыцця аўтара, храналогія літаратурных і іншых падзей адзначанага перыяду. Гэта само жыццё — складанае,

супярэчлівае, канфліктнае. Жыццё ў рамантычнай афарбаванасці і драматычнай абвостранасці. Жыццё дынамічнае — у філасофскіх развагах і літаратурных спрэчках. Жыццё для сённяшніх пакаленняў часам не вельмі зразумелае і не зусім пазітыўнае. Але яно было. І пісьменнік адлюстраваў яго менавіта такім, якім яно было. У гэтым яго бясспрэчная заслуга.

**Валянціна Локун.**